ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 7 (975) | ЧАЦЬВЕР, 9-га студзеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

За рашучы паварот

(Да пленуму ЦК ЛКСМБ)

Учора зачыніўся пленум ЦК КП(б)Б. Гэты пленум мае для работы комсамолу, надзвычайна важнае палітычнае значэньне. Асаблівасьць гэтага пленуму заключаецца ў тым, што ён абгаварыў шэраг пытаньняў зьвязаных з узьняцьцем работы ўсяго ЛКСМБ падцягненьнем тэмпаў работы комсамолу да тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва. Пленум ЦК ЛКСМБ які зьбіраецца пасьля пленуму ЦК КП(б) асабліва востра павінен завастрыць пытаньні далейшай работы комсамолу.

ЛКСМБ працуе ў абставінах абвостранай клясавай барацьбы, якая выклікана нашым разгорнутым наступам на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, у абставінах дробна-буржуазнага абкружэньня, у абставінах упартай барацьбы за генэральную лінію партыі.

Усе гэтыя фактары патрабуюць ад комсамольскай організацыі мобілізацыі сваіх сіл і энэргіі на барацьбу за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, на перабудову сваіх тэмпаў, форм і мэтадаў работы прыстасаваўшы іх да задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Комсамол Беларусі ў сваей масе ў асноўным зьяўляецца здаровай організацыяй, здольнай выконваць задачы, якія стаяць перад партыяй і комсамолам.

Аднак, у рабоце комсамолу Беларусі і ў яго кіраўніцтве мелі месца шэраг буйных палітычных памылак і хібаў, на якіх павінна быць згрупавана ўвага мас комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі з тым, каб яшчэ больш разгарнуць бязьлітасна бальшавіцкую самакрытыку і пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі іх выправіць.

ЦК УсеЛКСМ у сваей пастанове гаворыць, што „масы комсамолу Беларусі да гэтага часу слаба мобілізаваны на барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам, недастаткова скарыстаны для гэтага выкрытыя факты прагай практыкі ў Наркомземе, Наркомасьвеце і інш“.

Удзел ЛКСМБ „у галіне сельскай гаспадаркі дзейнасьць організацыі комсамолу была накіравана галоўным чынам на ўзьняцьце паасобных гаспадарак, комсамол слаба ўдзельнічаў у соцыялістычнай перабудове вёскі на базе вытворчага кооперававаньня і колектывізацыі. Правядзеньне колектывізацыі сустракае ў цэлым шэрагу месц актыўнае супроцьдзейнічаньне нават з боку комсамольцаў, у організацыі маюць месца настроі, орыентыруючыя разьвіцьцё сельскай гаспадаркі па лініі організацыі хутароў, пяцідворак і г. д.

ЦК УсеЛКСМ лічыць, што ЛКСМБ і яго кіруючыя камітэты празявілі яўнае прымірэнцтва да фактаў кулацкай політыкі і практыкі. Выступленьні заможна-кулацкіх элемэнтаў у шэрагу выпадкаў не атрымалі неабходнай політычнай ацэнкі і належнага адпору з боку комсамолу. Да гэтага часу ў большасьці месц зусім адсутнічае работа з бядняцкай і батрацкай моладзьдзю, ня гледзячы на асобныя паказаньні па гэтаму пытаньню ў рашэньнях ЦК УсеЛКСМ па дакладу ЦК ЛКСМБ у красавіку 1927 году“.

На фронце ўдзелу ЛКСМБ у нацыянальна-культурным будаўніцтве ЦК УсеЛКСМ адзначае: «Недаацэньваючы політычнага значэньня задач беларусізацыі (актыў, мова і інш.), організацыя зусім слаба ўдзельнічае ў разгортваючымся нац. культурным будаўніцтве рэспублікі, у барацьбе за пролетарскі зьмест нац. культуры. Слаба мобілізаваны масы працоўнай моладзі для наступленьня на клясавага ворага на ідэолёгічным фронце; у прыватнасьці організацыя комсамолу не дала рашучага адпору падняўшаму голаву нацыянал-дэмократызму і шовіністам усіх колераў, часта застаючыся ў баку ад барацьбы з імі, у выніку чаго маюць месца падпаданьне асобных зьвеньняў комсамолу пад уплыў нацыянал-дэмократаў. ЦК УсеЛКСМ рашуча асуджае пасыўныя адносіны кіраўніцтва і організацыі да яўна-контррэволюцыйнага выступленьня трох беларускіх пісьменьнікаў (Зарэцкага Александровіча і Дудара) і да выступленьняў з ідэямі аб самабытнасьці беларускай культуры“.

Бязумоўна, што ўсе гэтыя прарывы і політычныя памылкі ў кіраўніцтве ЛКСМБ зьяўляюцца вынікам.

„значнага адрыву кіраўніцтва ад мас і зусім нездавальняючае становішча работы комітэту па перабудове сваёй работы, ЦК УсеЛКСМ прызнае практычную дзейнасьць ЦК ЛКСМБ нездавальняючай, не адпавядаючай па свайму зьместу тэмпу і мэтадам кіраўніцтва, запатрабаваньням бягучай паласы разьвіцьця саюзу. Наліча адзначаных політычных памылак і недахопаў у рабоце організацыі тлумачыцца недастаткова выразнай політычнай лініяй ЦК ЛКСМБ.

Пленум ЦК ЛКСМБ павінен з усёй рашучасьцю завастрыць увагу ўсёй організацыі ЛКСМБ па выпраўленьне гэтых памылак. На гэта трэба мобілізаваць ярасьць мас комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі. Шырокае разгортваньне бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі сваіх недахопаў, якая да гэтага часу была разгорнута слаба і накіраваць актыўнасьць мас комсамольцаў на барацьбу за генэральную лінію партыі.

ЛКСМБ павінен яшчэ больш мобілізаваць усю сваю ўвагу, энэргію, актыўнасьць мас комсамолу і рабочай моладзі на барацьбу з правым ухілам, які ўяўляе галоўную небясьпеку ў партыі і ў комсамоле, рашуча выкрываючы конкрэтных носьбітаў яго ў тэорыі і на практыцы і прымірэнцтвам да яго.

Патрэбна самым бязьлітасным чынам даваць па руках усім тым, хто ня хоча праводзіць і ня выконвае генэральнай лініі партыі. Тэорыя перавыхаваньня кулака ў комсамоле мае ні што іншае, як бухарынскую тэорыю мірнага ўрастаньня кулака ў соцыялізм. Прымірэнцтва да скрыўленьня клясавай лініі, адмаўленьне ісьці ў колгас, патураньне кулаку, адход з фронту клясавай барацьбы і г. д.

Усе гэтыя факты павінны знайсьці жорсткі непрымірымы адпор у комсамоле.

Апошні пленум ЦК УсеЛКСМ асабліва выразна падкрэсьліў, што асноўная задача УсеЛКСМ зараз зьяўляецца:

«У тым, каб павярнуцца ўсёй сваёй масай у бок сапраўднага ўдзелу ва ўсіх галінах гаспадарча-культурнага будаўніцтва: падпарадкаваць усю сваю работу, кожны крок свайго руху задачам шпарчэйшага выкананьня пяцігодкі; возглавіць актыўнасьць моладзі ў гасп. будаўніцтве; авалодаць тэхнічнай культурай, пранізваючы ўсе свае мерапрыемствы клясава - пролетарскім зьместам, загартоўваць масы комсамольцаў у духу бальшавіцкай непрымірымасьці да ўсякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі ў духу бязьлітаснай барацьбы з правым ухілам у тэорыі і на практыцы, як галоўнай небясьпекі, і рашучага адпору дробна-буржуазным мніма рэвалюцыйным „левым“ фразам, стаць сапраўды «ударнай групай, якая ў сваёй рабоце аказвае сваю дапамогу, праяўляе сваю ініцыятыву, свой пачын» (Ленін). Вось якая генэральная ўстаноўка работы УсеЛКСМ на другім годзе пяцігодкі». (З рашэньняў апошняга пленуму ЦК УсеЛКСМ).

Рашуча праводзячы гэтую ўстаноўку ЛКСМБ павінен выпраўляць таксама асабліва сур'ёзныя недахопы і памылкі на фронце ідэолёгічнай барацьбы і на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Неабходна мобілізаваць масы на рашучую барацьбу з беларускім нацыянал-дэмократызмам як самым небясьпечным на даным этапе разьвіцьця, у той-жа час узмацніць рашучую барацьбу з усялякага роду шовінізмам усіх колераў, рашуча выкрываючы сутнасьць іх контррэволюцыйнай ідэолёгіі.

Комсамол Беларусі павінен з усёй рашучасьцю паставіць пытаньне аб поўным авалоданьні беларускай мовай, якая зьяўляецца магутнай зброяй партыі і комсамолу ў барацьбе з нацыянал-дэмократызмам, а таксама зьяўляецца адным з асноўных сродкаў па ажыцьцяўленьню кіруючай ролі пролетарыяту да асноўных мас сялянства.

Мы павінны асабліва востра паставіць пытаньне аб уцягненьні шырокіх мас комсамольцаў, беспартыйнай рабочай, батрацкай, бедняцкай і серадняцкай моладзі ў будаўніцтве пролетарскай нацыянальнай культуры, авалодаць усімі яе высотамі.

Растлумачваючы ленінскую сутнасьць нацыянальнай політыкі партыі сярод шырокіх мас, комсамол адначасова павінен быць баявым памоцнікам партыі на удзелу ў будаўніцтве беларускай культуры „нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьместу“.

У галіне ўдзелу комсамолу ў гаспадарчым будаўніцтве мы павінны ва ўсю шырыню паставіць пытаньне аб рашучым павароце тварам да гаспадарчага будаўніцтва. Нам патрэбна перабудаваць свой зьмест, свае формы мэтады і тэмпы работы саюзу і прыстасаваць іх да задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Шырокае разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва, уцягненьне шырокіх пластоў комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі ва ўдарніцкі рух, прыцягненьне шырокіх мас да задач соцыялістычнай рэконструкцыі прамысловасьці, перабудова работы ячэек і прыстасаваньне не да беспераынкі, пры адначасным узмацненьні увагі з боку комітэтаў і ячэек комсамолу да экономічна-культурнага абслугоўваньня рабочай моладзі, — вось вузлавыя пункты гаспадарчай работы комсамольскіх ячэек гораду.

Практычнае ажыцьцяўленьне задач партыі па лініі соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, прыстасаваньне ўсяго зьместу і форм работы ячэек да задач партыі ў галіне суцэльнай колектывізацыі вёскі і рашучага выкарчоўваньня карэньняў капіталізму і канчатковага зьнішчэньня кулака, як клясы.

Узмацненьне і прыстасаваньне зьместу работы колгасных ячэек, сваечасовая падрыхтоўка і ажыцьцяўленьне задач вясновай пасяўной кампаніі, рашучая барацьба з рэшткамі кулацкай палітыкі былога кіраўніцтва Наркамзему, узмацненьне работы ў саветах, коопэрацыі, КСУ —усе гэтыя пытаньні павінны быць у асяродку ўвагі комсамольскай організацыі вёскі.

Пастаўленыя задачы перад комсамолам могуць быць выкананы толькі пры ўмове шырокага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі і крытыкі ўсёй нашай работы, прыцягненьне да практычнага выкананьня гэтых задач шырокімі масамі комсамолу, беспартыйнай рабочай, бядняцкай, батрацкай і серадняцкай моладзі.

Узмацненьне партыйнага кіраўніцтва комсамолам.

Поўнага выкананьня лёзунгу аб 100 проц. ахопу рабочай моладзі комсамолам пры падняцьці політычнага ўзроўню мас. Пры гнуткасьці нашага кіраўніцтва і шырокім выхаваньні новых кадраў актыву, пры падняцьці тэмпу работы ЛКСМБ да тэмпу соц. будаўніцтва.

Уся гэта работа павінна быць наскрозь пранізана непрымірымай барацьбой за правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі.

Клясавая барацьба абвастраецца

Пашыраецца эканамічны крызіс у Польшчы

Масавыя рэволюцыйныя дэмонстрацыі ў Румыніі і Вэнгрыі.—У Нямеччыке тысячамі выкідваюць рабочых.—Катастрафічны рост беспрацоўя ў Аўстрыі

Жорсткая забастоўка ў Лодзі

ВАРШАВА, 7. У Лодзі ўжо два тыдні працягваецца жорсткая забастоўка рабочых джутовай прамысловасьці. Забастоўку пачалі 1500 рабочых, а зараз агульны лік бастуючых складае звыш 6000 чалавек.

Прычына забастоўкі—протэст супроць вялікага зьніжэньня зарплаты, зробленага прамыслоўцамі наперакор колдагавору.

ВАРШАВА, 7. У Барыслаўскім раёне пачаліся скарачэньні рабочых нафтавых промыслаў. Сярод беспрацоўных пануе вялікае абурэньне.

У лодзінскай тэкстыльнай прамысловасьці прадстаяць новыя скарачэньні. Буйнейшы лодзінскі фабрыкант Шэйблер звальняе чарговую партыю рабочых у 300 чалавек. Некалькі буйных фабрык наогул зачыняюцца.

Забастоўка 7000 тэкстыльшчыкаў

ПАРЫЖ. 6. Агэнства Гавас паведамляе, што ў Рэнэ (Паўднёва-Заходняя частка Бэльгіі) забаставалі 7 тысяч тэкстыльных рабочых, якія патрабуюць павышэньня зарплаты.

Сяляне Нямеччыны адмаўляюцца плаціць падаткі

БЭРЛІН, 6. У сувязі з крызісам у сельскай гаспадарцы, сялянства Усходняй Прусіі перажывае вострую патрэбу. У шмат якіх мясцовасьцях сяляне пераходзяць на шлях рашучай барацьбы за свае інтарэсы. прымаючы на сходах пастановы аб адмаўленьні ад плацяжу падаткаў.

Дэмонстрацыі беспрацоўных ахапілі ўсю Вэнгрыю

ВЕНА, 6. Па ўсёй Вэнгрыі адбываюцца дэмонстрацыі беспрацоўных пад лёзунгам: „Работы і хлеба“.

Напалоханая баявым настроем беспрацоўных соцыял-дэмократычная партыя імкнецца сарваць гэты рух. Яна пераконвае беспрацоўных абмежавацца абраньнем дэлегатаў для перагавораў з гарадзкой уладай, аб выдачы дапамогі.

Адначасова соцыял-дэмократычны друк падкрэсьлівае, што рост руху беспрацоўных пагражае капіталістычнаму ладу і на гэтай падставе заклікае ўрад „прыняць тэрміновыя меры“.

ВЕНА, 6. Па паведамленьнях з Бухарэсту дэмонстрацыі рэволюцыйных беспрацоўных у Румыніі працягваюцца. У Бухарэсьце і Констанце ў часе буйных дэмонстрацый беспрацоўных у суботу пасьля поўдню, адбылося шэраг сутычак з паліцыяй, якой толькі к вечару ўдалося разагнаць дэмонстрантаў.

Катастрафічны рост беспрацоўя ў Аўстрыі

ВЕНА, 6. Беспрацоўе ў Аўстрыі расьце катастрафічна. У адной толькі Вене за другую палову сьнежня лік беспрацоўных вырас на 10522 чалавекі.

Масавыя звальненьні рабочых

БЭРЛІН, 6. У Нямеччыне працягваюц на масавыя звальненьні рабочых. Гэтымі днямі зачынена адна з гамбурскіх вэрфей і звольнена 14 тысяч рабочых. Новыя масавыя звальненьні прадстаяць таксама ў Рэйнска-Вестфальскай і Рурскай вобласьцях (г. зн. у раёне цяжкай прамысловасьці).



„Навукозы“ твор інстытуту

На гаагскай гаварыльні

ГААГА, 5.—Сёньняшнія перагаворы паміж аўстрыйскай дэлегацыяй з аднаго боку і чэха-славацкай, румынскай і польскай дэлегацыямі—з другога не прывялі ні да якіх вынікаў.

ГААГА. *Пытаньне аб „санкцыях“ (г. зн. аб рэпрэсыўных мерах супроць Нямеччыны ў выпадку парушэньня ёю рэпарацыйных абавязацельстваў) працягвае выклікаць вострыя спрэчкі на гаагскай конфэрэнцыі. Па агульнай думцы, гэтае пытаньне ня будзе выратана ў Гаазе. У гэтым выпадку Францыя будзе лічыць, што права выкарыстоўваць „санкцыі“, устаноўленае Вэрсальскім дагаворам захоўваецца ў поўнай сіле.*

Сур'ёзныя трэньні выклікае таксама пытаньне аб „гарантыях“ рэпарацыйных плацяжоў. Француская дэлегацыя патрабуе каб у якасьці „гарантый“ быў устаноўлен сталы кантроль над прыбыткамі нямецкай казны ад чыгунак і дзяржаўных манаполій.

Яшчэ адзін суд над Тарашкевічам

ВІЛЬНЯ. У віленскім акруговым судзе гэтымі днямі будзе слухацца адна з шматлікіх судовых спраў, узьнятых супроць былога дэпутата Тарашкевіча, лідэра Беларускае Грамады. Тарашкевіч знаходзіцца ў турме засуджаны па справе Беларускай Грамады на 6 год катаргі. На гэты раз супроць яго ўзьнята справа па абвінавачаньні за прамову, якую ён нібы сказаў на нелегальным сялянскім мітынгу.

На абгаварэньне чытачоу

У чым я вінават перад комсамолам

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Таварышы комсамольцы!

Апошні час я наглядаю недаацэнку маёй актыўнасьці. недаверра мне комсамольцу-селяніну. Такія адносіны пабуджаюць мяне і я хачу расказаць усю гісторыю майго паходжаньня і атрымаць правідловы адказ.

На курсы комсамольскага актыву я командыраван як бядняк, як найлепшы актыўны працаўнік вёскі і той ячэйкі дзе я апошні час працаваў. У сапраўднасьці-ж мой бацька лічыцца **серадняком.**

Пасьля земляўпарадкаваньня якое адбылося з 1924 па 1927 год, мой бацька на 6 едакоў атрымаў 10 гектараў зямлі (па даходнасьці 30 руб. з гектару, якой мы да 1925 году ня мелі), адзін гектар сенажаці (заліўной) і 4 гектары няўдобіцы. Уся зямля да 1927 году не засявалася з тэй прычыны, што ня было магчымасьці і сродкаў. Толькі пры дапамозе камітэту Узаемадапамогі нам прышлося перайсьці на шматпольле і засяваць усю зямлю.

З іншай маемасьці ў гаспадарцы маецца: двое коняй, дзьве каровы, тры авечкі і двое сьвіней, хата, хлеў і гумно. Едакоў у гаспадарцы разам са мною 6 чалавек. Сельска-гаспадарчага палатку на 1929-30 год налічана 46 рублёў 50 кап. Вось тая маемасьць, якую мае мой бацька і ўдзельнікам якой зьяўляюся і я.

Гэтае социяльнае становішча часткова мучыць мяне. Я часта расчароўваюся у працы і думаю, ці справідлова я камандыраван і займаюся на курсах?

Зараз у нас організоўваецца колгас, бацька мой покуль яшчэ не ў колгасе. Мабыць у далейшым ён уступіць у яго, аб гэтым зараз я сказаць ня маю магчымасьці.

Я-ж сам да 1926 году быў 5 год пастухом. Пасьля пашоў вучыцца ў сямігодку і скончыў 6 клясаў. Далей вучыцца ня было матэрыяльнай магчымасьці.

Вучыцца і працаваць я маю вялікую ахвоту, але гэтага я дасягнуць покуль што ня маю магчымасьці.

Спагнаньняў комсамольскіх я ня маю. Да гэтага часу прымаў актыўны удзел у выкананьні тых кампаній і задач якія ставіла і ставіць комуністычная партыя і савецкая ўлада перад комсамолам.

Я лічу не комсамольскім пастулкам, што ў анкеце для паступленьня на курсы я паставіў „бядняк".

Гэта я зрабіў з тэй прычыны, што я вельмі хацеў вучыцца і вучыцца грамадзкасьці, як гэта і ёсьць на курсах комсамольскага актыву.

Тое, што мой бацька абкладзены ў індывідуальным парадку, гэта ня справідлова, магчыма запрасіць даведку з сельсавету. Ад бюро ячэйкі і комсамольскай арганізацыі я жадаю атрымаць наступны адказ:

Ці правільна зрабілі, што камандыровалі мяне на курсы? Ці вінават я перад комсамолам за свой паступак? Ці патрэбен я зараз комсамолу і курсам? І ці мэтазгодна мяне заставіць на курсах у далейшым?

На ўсё гэта прашу даць падрабязны адказ.

Курсант курсаў комсамольскага актыву Кізееў Васіль Ільлёў.

Менск.

Ад рэдакцыі: Ставячы на абгаварэньне ліст тав. Кізеева В. рэдакцыя зварочваецца да комсамольцаў і ўсіх чытачоў „Чырвонай Зьмены" калектыўна і індывідуальна абгаварыць ліст Кізеева і даслаць свае водгукі ў рэдакцыю па наступным пытаньням: У чым заключаецца праступак т. Кізеева? Ці добры комсамолец Кізееў? Ці правідлова зрабіла ячэйка комсамольскіх курсаў, выключыўшы яго з комсамолу?

Упаўнаважаныя „Чырвонай Зьмены"

Нарада яч. упаўнаважаных „Чырвонай Зьмены"

КАСТРЫЧНІКАЎСКАГА Р-НУ,

адбудзецца 10-га студзеня г. г. (пятніца), а 6-ай гадз. вечара ў памяшканьні Дому Комсамолу (пакой-чытальня клюбу, Комсамольская, 25).

Упаўнаважаныя ад сходаў, нарад і г. д. АСЛАБАНЯЮЦЦА.

Таксама павінны зьявіцца яч. упаўнаважаныя Фрунзэнскага р-ну, якія ня прысутнічалі на нарадзе 7-1—30 г. як-та: яч. заводу Дрэваапрацоўшчык, шк. будаўнікоў, 2-ххарч. заводаў, 1-га аддз. хлебзаводу, сталовых МЦРК, Эльвода, Польпэдтэхнікуму, „Чырвоны Тэкстыльшчык", Шпалернай ф-кі, ф-кі Шорнікаў, канфетнай ф-кі, галянтарэйнай ф-кі, яч. ГЭТ, Аўтатранспарту, Хлебазаводу, Нарсувязі, ЦСУ, Працасьветы, саюзная друкароў, Белдзяржбуду і Мэдсанпрацы.

ЯЎКА АБАВЯЗКОВА

Эканомяць грашы—трацяць тысячы

На Рэчыцкім вяровачным заводзе пануе безгаспадарнасьць.—На фабрыцы „Адраджэньне" загадчыкаў шмат, толку мала.—П/к друкароў упяршыню дасягнуў 28000 рублёў прыбытку

Комсамольцы, маладыя рабочыя! Выкрывайце безгаспадарнасьць і безгаспадарнікаў. Пакажэце прыклад комуністычных адносін да вытворчасьці

УПЯРШЫНЮ

За мінулы 1928-29 гаспадарчы год, дзякуючы адданасьці рабочых і адміністрацыі ўпяршыню за ўвесь час свайго існаваньня п-к друкароў вышаў з прыбыткам у 28.000 руб.



„Здарава! У догаворы пунктаў больш, чым у гаду рабочых дзён".

Калі ўспомніць, што колектыў да гэтага часу яшчэ, як сьлед, не абсталёван, не хапае машын, частка іх надта зношана і г. д., дык гэтыя посьпехі трэба лічыць надта вялікімі.

Яшчэ ёсьць шмат таго, што трэба зьнішчыць, каб і надалей дасягаць усё новых і новых посьпехаў у рабоце. Рэзка кідаецца ў вочы тое, што соцыялістычнае спаборніцтва ў колектыве **неяк не адчуваецца.** Назіраюцца развažаньні ў час працы, спрэчкі паміж рабочымі і г. д.

Бывае так, што спушчаная форма на машыну перарабляецца на самай машыне. Часта рэзка паперы робіцца тады, калі набор ужо ў машыне і прыпраўлены, ад чаго бываюць прастоі. Прастоі з-за корэктуры і перамен бываюць па 4 і 7 гадзін таму, што аднаму наборшчыку прыходзіцца спраўляцца з некалькімі формамі ў адзін раз.

Н. А.

„ДОБРА"... „ЗРОБІМ" —„ЧАКАЙЦЕ"

На акраіне Рэчыцы стаіць даўжэзны дзіравы хлеў,—гэта і ёсьць **вяровачны завод,** на якім працуе каля **70—80** рабочых, у большасьці моладзь. Райком комсамолу ніякай работы сярод працоўных не вядзе. Дзякуючы таму, што не прыстасавана работа ячэйкі да абслугоўваньня моладзі на роднай мове маецца шэраг недарэчнасьцяў.

У выніку такой „увагі" з боку РК і іншых організацый на заводзе працуюць замест 8 гадзін **па 9-10.** Працдысцыпліна адсутнічае, наглядаюцца сыстэматычныя прагулы і спазьненьні. Загадчык заводу **Горыводзкі** толькі і ведае, што выносіць вымовы і на від. Соцыялістычнае спаборніцтва тут **не знайшло спачуваньня.** Не разумеюць кіраўнікі заводу і форма праз якія павінна праводзіцца со спаборніцтва. Ударныя брыга складаюцца на заводзе не на па ставе ініцыятывы і дабраахвотнась рабочых, а шляхам выбараў агульным сходзе. Напрыклад **бры гаду з 2-х чалавек нядаўн абраў сход.**

Нічога ня робіцца ў напрамк культурнага абслугоўваньня прац ючых. За год вышаў адзін нума насьценгазэты, на заметкі яко таксама ніякага рэагаваньня быдо. Ня было праведзена ніводна гутаркі з рабочымі па таму ці ін шым пытаньню, хаця патрабаван ні з боку рабочых былі.

Цішка Верны.

ВЯЛІКАЯ ФАБРЫКА І БЕЗГАСПАДАРНАСЬЦЬ НЕМАЛА

Фабрыка „Адраджэньне" адна з найвялікшых у Менску. У адпаведнасьці сваёй вялічыні мелася і бесгаспадарнасьць. Фабрыка толькі на сёнешні дзень ледзь-ледзь выбілася з дэфіцыту. Некаторыя цэхі па ініцыятыве рабочых цалкам абвясьцілі сябе ўдарнымі (сталярны цэх). Адміністрацыя ў гэтым нічым не дапамагала.

Заўвагі рабочых, аб выпраўленьні тых ці іншых недахопаў у вытворчасьці, адміністрацыяй НЯ ЎЛІЧВАЛІСЯ. Частая зьмена дырэктароў таксама спрыяла безгаспадарчаму вядзеньню фабрыкі. Некалькі дзён таму назад ЛОПНУЎ КАЦЁЛ ПАРАВОГА АТАПЛЕНЬНЯ, ДЗЯКУЮЧЫ ТАМУ, ШТО АДМІНІСТРАЦЫЯ ПАСТАВІЛА Ў КАЧАГАРКУ ЧОРНАРАБОЧАГА, ШКАДУЮЧЫ ДАЦЬ КВАЛІФІКАВАНАМУ КАЧАГАРУ 100 РУБЛЁЎ. У ВЫНІКУ З'ЭКАНОМІЛІ 100 РУБЛЁЎ, А СТРАЦІЛІ 2500.

І па сёнешні дзень на двары гніюць такарныя варштаты для сталярнага цэху каштоўнасьцю ў 300 рублёў. Аб гэтым ужо многа раз пісалася і гаварылася, на што адміністрацыя не зьвяртае ўвагі. Лазавы цэх амаль спыніў працу па віне гаспадарнікаў, якія своечасова не дагаварыліся аб дастаўны сыравіны. Адзін з адміністратараў (а іх у нас 4)—ГРАЗОЎСКІ паеха па сыравіну і ўжо больш месяц езьдзіць з аднаго гораду ў друг траціць сродкі, а матар'ялаў як н было, так і няма.

Ужо два гады, як мяркуюць ор ганізаваць вучнёўскія брыгады. на справе-ж адміністратары ўпарт адвільваюць ад гэтага. К прыкла ду, у сьлясарным цэху замест вучняў, як прадугледжана колд гаворам, адміністрацыя бярэ тол кі 4. Калі сэкратар комсамол скага колектыву напомніў адмін стратару аб гэтым, дык тав. НА ПЯРКОЎСКІ адказаў: „НЕ ТВА СПРАВА І Ў ГАСПАДАРЧАЕ К РАЎНІЦТВА НЯ ЎМЕШВАЙСЯ". Мастычны і скульптурны цэхі за поўнены, амаль поўнасьцю мо ладзьдзю, атрымліваюць яны ўс па вучнёўскаму разраду. Нагляда юцца частыя перакідваньні рабо чых з аднаго цэху ў другі, дзяку ючы чаму часта перакінутыя н выпрацоўваюць сваёй стаўкі.

На скаргі рабочых аб непарадк Напяркоўскі адказвае: „НА БІРЖ ВОН. КАЛІ НЯ ХОЧАШ ПРАЦА ВАЦЬ". На фабрыцы холадна, б паравое атапленьне не працуе

ПІЛА.

Папярэднія вынікі правядзеньня хлебазагатовак

Выкананьне плянаў хлебазагатовак зьяўляецца важнейшым зьвяном у ажыцьцяўленьні задач соцыялістычнага будаўніцтва, навокал якога разгорнута жорсткая клясавая барацьбы; хлебазагатоўкі—неадлучная частка соцыялістычнай пяцігодкі. У 1918 годзе Ленін гаварыў: „Здаецца, што гэтая барацьба толькі за хлеб, але на самай справе гэта барацьба за соцыялізм. Барацьба за хлеб, за тое, каб хлебныя лішкі былі сконцэнтраваны ў складах дзяржавы—ёсьць барацьба за плянавасьць соцыялістычнага будаўніцтва.

Галоўная задача—у найкарацейшы час выканаць пляны

Галоўная задача, якую ставіла партыя ў хлебазагатоўчую кампанію 1929-30 годзе выказвалася ў тым, каб выкананьне хлебазагатоўчых плянаў закончыць у максымальна найкарацейшы час. Гэта задача правымі опортуністымі была сустрэта вельмі скептычна. Яны лічылі, што разьвязаць такую задачу зусім немагчыма. Плян, які павялічаны ў паўтары разы за чатыры-пяць месяцаў нельга выканаць—так развažалі „трэзвыя" палітыкі з правага лягеру.

Трэба сказаць, што аб немагчымасьці павялічэньня пляну многа гаварылі нават і такія таварышы, якія далёка ад таго, каб лічыць сябе правымі, нават, у такіх мясцох, дзе выкананьне пляну ішло добра з самага пачатку, і дзе плян быў выканан раней тэрміну даказвалі, што плян перавялічаны

Шмат якія таварышы, у тым ліку і некаторая частка комсамольцаў, не разумелі, што такое імкненьне да зьмяншэньня пляну—гэта і ёсьць сапраўдны правы ўхіл. Гэтыя адносіны да пляну трэба запамятаць на будучы год, каб своечасова рэагаваць на такія развažаньні і біць па іх, як шкодных для справы соцыялістычнага будаўніцтва. Зараз можна констатаваць, што такая тэндэнцыя мелася, у асабліваські, у нізавых працаўнікоў, а правыя ва ўсё горла крычалі, што плян перавялічаны, што ён ня можа быць выкананы, асабліва ў такія тэрміны, як вызначана партыяй.

Жыцьцё разьбіла прароцтвы правых

Аднак, як мы бачым, на справе адбылося інакш. Жыцьцё разьбіла прароцтвы правых. На 1-ае сьнежня плян хлебазагатовак па Саюзу быў выкананы цалкам, а весткі першай пяцідзёнкі гаварылі, што па Беларусі на 6-ае лістапада плян выкананы з перавышэньнем. Кастрычнік месяц у загатоўцы збожжа і бульбы на Беларусі быў пераломным. За кастрычнік выканана 80 проц. гадавога заданьня па загатоўцы збожжа і шырока разгорнута праца па забесьпячэньню рабочых Ленінграду і Масквы бульбай. Гэта быў месяц вялікага тэмпу выкананьня загатоўчых плянаў.

Урад пасьля поўнага выкананьня заданьня па загатоўках заожжа вынес пастанову дадаткова загатовіць хлеба на 30 проц., якое патрэбна было выканаць да 1-га сьнежня. Гэта дырэктыва выканана з некаторым перавышэньнем.

Вялізарны тэмп выкананьня загатовак ня толькі збожжа, але і ўсіх культур трэба тлумачыць мобілізацыяй ініцыятывы шырокіх працоўных мас на гэту справу, што лінія партыі была адзінаправільнай і што дзякуючы правядзенью яе ў жыцьцё, мы выканалі пляны ў кароткі час.

Выразнасьць дырэктыў партыі

Цэнтральны камітэт партыі ў сваіх дырэктывах па пытаньню хлебазагатоўчай кампаніі 1929-30 году з усёй выразнасьцю адзначыў, што гэтая кампанія стане арэнай клясавай барацьбы, што праз зрыў хлебазагатовак кулак захоча сарваць усе пляны соцыялістычнага будаўніцтва і ў асаблівасьці перашкодзіць соцыялістычнай перабудовы вёскі. Што партыя і загатоўчыя організацыі з першых дзён кампаніі павінны пасланы усе лепшыя сілы на загатоўчы фронт. Спачатку хлебазагатоўчай кампаніі мы пайшлі ў наступленьне на кулака. Работа па выкананьню пляну была пабудавана так, што батрацкі і бядняцка-серадняцкі актыў зьявіўся актыўным праваднікам у адносінах нажыму на заможную кулацкую вярхушку вёскі.

Былі факты скрыўленьня клясавай лініі

Трэба сказаць, што дырэктывы партыі ня ўсюды зразу былі ўцямлены і ня ўсюды праводзіўся ў жыцьцё рашучы нажым на заможна-кулацкую частку вёскі. Юнкор з Стара-Дарогскага раёну (Бабруйшчына) піша: „Кулацкай гаспадарцы вызначана здаць 30 пудоў, а серадняцкай—28". Такія выпадкі характэрны ня толькі для аднаго раёну, але і для іншых раёнаў Беларусі.

Тое, што ў першым квартале (чэрвень-верасень) выканана было толькі 20 проц. гадавога заданьня, а за 25 дзён кастрычніка—50 проц., а ўагульвай складанасьці БССР на гэты час было загатоўлена 73 проц., сьведчыць аб тым, што мы спачатку кампаніі недастаткова нажалі на тую частку вёскі, у якой сконцэнтравана большасьць хлебных лішкаў Такое становішча прымусіла адпаведныя організацыі констатаваць, што на гэтым фронце ня ўсё добра і вызначыць усе неабходныя захады, якія-б забясьпечылі паступленьне хлеба ад заможна-кулацкай часткі вёскі.

Комсамол па-баявому удзельнічаў у загатоўках

Комсамольская організацыя ўва ўсёй працы па загатоўцы збожжа і бульбы сапраўды па-баявому вырашала дырэктывы партыі. Комсамольскія камітэты і ячэйкі вылучалі лепшыя сілы на вучасткі хлебазагатоўчай працы. Яны організоўвалі ўдарныя брыгады і ў сваёй большасьці комсамольскія ячэйкі працу па хлебазагатоўках паставілі стрыжнем сваёй штодзённай практычнай работы. Комсамольская організацыя вытрымала політычны экзамен і тых, хто ня здолеў быў, не хацеў праводзіць у жыцьцё дырэктыў партыі, організацыя адсявала. Разам з тым, у час хлебазагатоўчай кампаніі ня ўсе райкомы комсамолу, ячэйкі і асобныя комсамольцы шчыльна падышлі да вырашэньня задач партыі у правядзеньні гэтай кампаніі. На старонках нашай газэты мы друкавалі матар'ял аб роспуску бюро парыцкага РК комсамолу за тое, што ў практычнай працы райорганізацыі па выкананьню пляну мела месца выкрыўленьне клясавай лініі ячэйкамі і асобнымі комсамольцамі, а кіраўніцтва райкому своечасова не рэагавала на гэта. Былі выпадкі, калі комсамольцы выступалі супроць загатовак і, нават скарыстоўвалі свае пасады ў сельсавеце, каб паменшыць лік здачы збожжа і бульбы гаспадаркы свайго бацькі. Юнкор Піскуя пісаў, што комсамолец, сэкратар сельсавету, які выпадкова папаў у комсамол, сыстэматычна выкрыўляў клякавую лінію ў працы камісіі па садзейнічаньню хлебазагатоўкам.

Комсамольская маса своечасова рэагавала на такія выступленьні і кваліфікавала іх ня інакш, як аказаньне дапамогі варожаму элементу ў барацьбе з намі. Організацыя самаачысьцілася ад тых, хто ня здолеў на практычнай працы праводзіць у жыцьцё генэральную лінію партыі.

З такімі тэмпамі, як правялі загатоўкі, рыхтавацца да сяўбы

Кампанія загатовак збожжа скончана. Пляны выкананы з перавышэньнем на 46 проц. Кожнаму камітэту, кожнай комсамольскай ячэйцы трэба памятаць, што партыя таму паставіла задачу выкананьня хлебазагатоўчых плянаў у найкарацейшы час, каб своечасова можна было заняцца справай выкананьня чарговых гаспадарчых задач. Асноўныя масы сялянства на справе павінны ўбачыць тыя вялікія выгады, тую вялікую карысьць, якая атрымана ў выніку хлебазагатоўчай работы ў такі кароткі тэрмін.

З такой энэргіяй, як праводзіліся хлебазагатоўкі, нашы ячэйкі павінны зараз узяцца за правядзеньне пасеўнай кампаніі і сканчэньне выкананьня плянаў загатовак ільну-валакна.

Задача сёньнешняга дню—пераключыць энэргію і ўсе сілы партыйнай і савецкай грамадзкасьці на канчатковае выкананьне ільну-загатоўчых плянаў і выканьне задач веснавой пасеўнай кампаніі, паставіў апошнюю стрыжнем штодзённай працы комсамольскай ячэйкі, комсамольскага камітэту.

Т. Галодка.

Лісток „лёгкай кавалерыі"

У дапамогу Раб.-Сял. Інспэкцыі

Вось яны--праваднікі кулацкіх спраў

Кайкаўскія сельсаветчыкі зрасьліся з кулацтвам, выяўлена 26 кулакоў неабкладзеных індывідуальна

Членамі горацкага сельскагаспадарчага крэдытнага таварыства лічыцца 217 кулакоў

Кіраўнікі Бярэзінскага раёну пакрывалі злачынствы падкулачнікаў

У ПАЛОНЕ КЛЯСАВАГА ВОРАГА

У „Чырвонай Зьмене" пісалася аб Кайкаўскім жывёлагадоўчым таварыстве у выніку гэтага РВК зьняў з працы кулака—старшыню гэтага таварыства Станішэўскага (жонка якога і цяпер настаўнічае), пасьля гэтага кулакі паднялі вой. Зьбіраецца сход беднаты, які праводзіць член прэзыдыуму сельсавету Канапацкі, ён-жа і дае ку-



Так адбываецца ў Кайкаўскім сельсавеце.

лаку Станішэўскаму характэрыстыку: „актыўны грамадзкі працаўнік, праводзіць строга клясавую (?!) лінію і яго па непаразуменьню пазбавілі выбарчых правоў". Пад націскам кулака Станішэўскага і „актывіста" Канапацкага, сход прымае гэту харатэрыстыку і просіць аднавіць кулака, індывідуальна - абкладзенага ў выбарчых правох. Такую рэзолюцыю прымае і сход сялян у вёскі Кайкава, у тым ліку 7 чырвоных партызан.

Усё гэта адбываецца на абшарах Астраўской ячэйкі ЛКСМБ і КП(б)Б, і ячэйкі на праявы кулацкага ўплыву на беднату не рэагуюць. Усё гэта не зьяўляецца выпадковым зьявішчам, бо калі мы прывядзем яшчэ шэраг фактаў, дык убачым клясавы твар гэтых ячэек.

У час хлебазагатовак на сходзе комсамолец — сябра бюро Астраўской ячэйкі Баркоўскі выступаў супроць загатовак. Комсамолец гэтай-жа ячэйкі Хмялеўскі гаварыў на сходзе ў час хлебазагатовак: „Навошта дзяржаве лезьці да нас у кішэні, навошта ёй рабаваць сялян". Сэкратар ячэйкі ЛКСМБ — партыец Камлюк заяўляў: „па нашаму сельсавету кулакоў няма", тое-ж самае гаварыў і сэкр. сельсавету Кліндзюк у той час калі зараз па сельсавету выяўлена 26 кулакоў недаабкладзедых індывідуальна. Кулакі: Бельскі, Станішэўскі, Харэўскі і інш. былі недаабкладзены ў час хлебазагатовак, у той час, калі некаторых сераднякоў абклалі больш чым трэба.

Ня гледзячы на пастанову РК КП(б)Б і РВК, аб колектывізацыі 60 проц. гаспадарак раёну па Кайкаўскаму сельсавету няма ніводнага калгасу і ня гледзячы на тое, што частка беднаты і серадняцтва ў 5 насяленных пунктах жадае організаваць колгасы, ячэйка КП(б)Б аб гэтым толькі гаворыць, але практычна нічога не зрабіла.

Падкулачніка Баркоўскага, ячэйка ЛКСМБ вылучыла кіраваць піонэрскімі атрадамі і ён „накіраваў" так, што зараз ніхто ня ідзе ў атрад.

У кіраўніцтве грамадзкіх організацый кулакі. У кооперацыі Савіч Даніла і Станішэўскі (якія зараз зьняты), загадчыкам Дубова-лесаўскай хаты-чытальні, Бягун Сьцяпан — актыўна выступаючы супроць колектывізацыі. У члены праўленьня камітэту ўзаемадапамогі папалі заможнікі, якія сабе бралі ссуду, праводзілі кулацкую лінію, частка з іх за актыўныя выступленьні супроць савецкай улады—арыштавана ворганамі ДПУ.

Заможнікі з вёскі Дубовы Лес пад аховаю сельсавету захоўваюць аб'екты абкладаньня. Бягун Паўлюк захаваў ад абкладаньня прыбытак ад кузьні, у якой працуе два наёмных работнікі; сын яго Іван зарабляе 80 рублёў у месяц. Кліндзюк Самусь прыпісаў два лішніх едакі і захаваў аднаго каня, Скрынка Ахрэм захаваў 1,33 дзесяціны зямлі. Сельсавет лічыць, што ў заможнікаў „хлеба няма" і ў час хлебанарыхтовак зьмяншаў ім раскладку.

У ільнузагатоўчай працы няма клясавай лініі, дадзенае кулакам заданьне ня выконваецца, а сельсавет мер ня прымае.

На прэзыдыуме сельсавету, дзе стаяла пытаньне, аб аднаўленьні ў выбарчых правох кулака—Станішэўскага і яго жонкі, члены прэзыдыуму выступалі ў абарону, кажучы, што „ён добры хлапец".

Усе гэтыя факты і шэраг іншых, якія мы ня прыводзім, кажуць за тое, што ячэйка КП(б)Б, ЛКСМБ і сельсавет скаціліся з клясавай лініі, і папалі ў палон клясавага ворага. Комсамольцы не давалі ніякага адпору контр-рэволюцыйным выступленьням разьюшанага кулацтва, а некаторыя з іх самі выказвалі кулацкія погляды.

„Правыя" справы ў Кайкаўскім сельсавеце не знаходзяць рашучага сваечасовага адпору з боку ячэек, да іх адносяцца прымірэнча, таму зараз неабходна рашуча сыгналізаваць аб гэтым і адпаведныя організацыі павінны прыняць тэрміновы захады.

АЛЕСЬ.

ЯКІЯ ЛЮДЗІ—ТАКІЯ І СПРАВЫ

У Горацкім сельска-гаспадарчым крэдытным таварыстве (Аршаншчына) працуе 15 асоб, твар большасьці гэтых асоб такі: Ждановіч—былы штабс-капітан, Кнушавіцкая—у мінулым жонка афіцэра, Паўзьнер—буйны гандляр, яго дзьве крамы заняты пад склады крэдытнага таварыства, ён перавёўся ў Горкі з Лидоў, дзе зрабіў растрату, а тут лічыцца нарыхтоўшчыкам, Лукін—пазбаўлен выбарчых правоў, Суздальцаў п'янствуе, працуе загадчыкам магазыну.

Трэба сказаць, што па „працаўніках" і справы. У таварыстве не разгледжана 292 бядняцка-серадняцкіх заяў аб крэдытаваньні, у той час, калі кулакі карыстаюцца крэдытам на 2889 рублёў. Калі кулакі сваечасова ня ўносяць крэдыты, дык ніякіх захадаў да іх ня прымаюць. У складзе членаў таварыства знаходзяцца 217 кулакоў. Заявы колгасаў аб крэдыце—залежваліся.

Да вясеньняй пасяўной кампаніі нічога ня зроблена.

Еф. З.

Пазбаўленцы ў апараце

У м. Ельску (Мозыршчына) у апаратах некаторых установ працуюць пазбаўленцы. Напрыклад, у камітэце Узаемадапамогі працуе пазбаўленец Гадаштэн у якасьці загатавіцеля, які нават не папаў пад чыстку савецкага апарату. У РВК працуе Маткоў, п'яніца, бюрократ, які перад чысткай вышаў з РВК, а пасьля зноў спакойна працуе. Таксама працуюць пазбаўленцы ў Белмясгандлі Міневіч Нохім і Арон, ня гледзячы на тое, што яны вычышчаны ў час чысткі з апарату.

„Лёгкая кавалерыя"

ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ „КЛЯСАВЫ" ПАДЫХОД

Некалькі год ў Талочынскім РВК (Аршаншчына) працуе сірата, беспрытульны Ламакін Алесь. Спачатку ён працаваў у якасьці броньвучня, атрымліваў 12 рублёў у месяц, а ў апошні час пераведзен справаводам і атрымлівае 25 руб. Дзякуючы кепскай матар'яльнай забясьпечанасьці Ламакін падаў заяву у прэзыдыум Талочынскага РВК аб выдачы яму дапамогі. Старшыня РВК накладвае рэзолюцыю „У хадайніцтве адмовіць з-за адсутнасьцю сродкаў". Але калі паглядзець у грашовыя кнігі РВК, дык убачым, што ў верасьні месяцы 1929 году член прэзыдыуму РВК загадчык грашовай часткі, атрымаў беззваротную дапамогу для падтрыманьня матарыяльнага становішча 50 руб.; у той час калі атрымлівае пэнсіі—70 рублёў у месяц. Крыху пазьней у лістападзе таксама выдаецца беззваротная дапамога сябру прэзыдыуму РВК загадчыку РЗК у памеры 40 рублёў, у той час калі ён таксама атрымлівае 70 рублёў у месяц і мае сувязь з сельскай гаспадаркай.

„Кавалерыстыя"



Ячэйка ў баку

Загразьлі у брудзе

У в. Міхалках, Нараўлянскага раёну, Мазырскай акругі, ёсьць крама аддзяленьне Мазырскага акруговага спажывецкага таварыства «Смычка». У гэтай краме пануе бруд—крамнік тав. Шахтман ніколі ня мые рукі, селёдкі на вагу кладзе рукамі, а пасьля важыць цукар, дзякуючы гэтаму ад цукру заўсёды пахне селядцом ці мылам. Налівае газу і ня выціраючы рук бярэцца за цукеркі. Цукеркі, якія не павінны былі прадавацца, таму, што абліты вуксусам, усё-ж такі прадаваліся.

На падлозе брудна і напляванa крамнік з бруднымі нагамі лезе ў засек па соль. Такім чынам у соль пападае бруд. 20-га сьнежня броньвучань крамы купіў маленькую шкурку і набраўшы з засекі сол пасаліў яе, а потым з шкуркі ссыпаў соль зноў у засек.

Вага ніколі ня чысьціцца, яна ўжо настолькі закарэла, што няспраўна важыць, праўленьне павінна зацікавіцца гэтымі фактамі.

Комсамолец.

Аб зьлетах „Л.К."

(Хроніка)

24-га сьнежня адбыўся зьлет „Л.К." Рагачэўскага раёну, ён працягваўся два дні. На зьлет зьявілася 76 чалавек, з іх—36 дэлегатаў вёсак раёну. Актыўнасьць на зьлёце была вялікая. Зьлёт адзначыў шэраг нелахопаў у працы „Л. К." і кіраўніцтве. На зьлёце быў абран штаб „Л. К. і два дэлегаты на Усебеларускі зьлёт.

К. Чабор.

* * *

У Марына-Горскай, Сяргеевіцкай, Блужскай, Талкоўскай, Гарэліцкай, Сінчэнскай ячэйках ЛКСМ Пухавіцкага раёну падрыхтоўчая праца да зьлётаў „ЛК" зусім не праведзена.

Сэкцыя РСІ пры РВК таксама, амаль што, нічога ня зроблена. Упаўнаважаны РСІ па адносіне АКК КП(б)Б аб зьлёце „ЛК" наклаў рэзолюцыю „да ведама і выкананьня" і на гэтым супакоіўся.

ЛК ЛКСМБ таксама належнай увагі падрыхтоўкі да зьлёту не зьвярнуў ня гледзячы на тое, што зьлёт назначан на 10 студзеня 1930 году.

ЮРКА.

* * *

У часе падрыхтоўкі да зьлёту „лёгкай кавалерыі" у гор. Воршы праведзена нарада сэкратароў ячэяк і кіраўнікоў „лёгкай кавалерыі". На фабрыках і заводах у час абедзенага перапынку праводзіліся гутаркі аб значэньні зьлёту „ЛК". Пытаньне аб зьлёце ставіцца на абгаварэньне партыйных ячэяк.

А. П.

* * *

Па Заслаўскаму раёну слаба разгорнута праца па падрыхтоўцы да зьлёту „Лёгкай Кавалерыі". Заслаўская ячэйка ЛКСМБ, як мястэчковая, павінна была даць прыклад другім ячэйкам, але гэтага няма. Заслаўскай ячэйкай КП(б)Б і райкомам ЛКСМБ ня зьвернута на падрыхтоўку належная ўвага. Слаба рыхтуюцца да зьлёту і другія вясковыя ячэйкі комсамолу. Напрыклад, Слабодзкая, Рагоўская, Ратамская і інш.

АВАДЗЕНЬ.

НЯДБАЙНАСЬЦЬ КУР'ЯНОВІЧА

Лістаносец КУР'ЯНОВІЧ, які абслугоўвае Сялецкі сельсавет, Грэскага раёну, нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў. Газэты разносіць несваечасова, а часта разносіць ня сам, а перадае праз пасыльных з-за чаго газэтых атрымліваюцца папэцканымі і парванымі.

З-за гэтага сялянства ня хоча зусім выпісваць газэты.—На што дарма грошы траціць, кажуць яны.

КРАПІВА.

Як бясчынствавалі бярэзінскія чыноўнікі

Яшчэ ў 1926 годзе на пасаду старшыні Арэшкаўскага сельсавету, Бярэзінскага раёну ўдалося правесьці Ермачонку. У перавыбарчую кампанію 1928 года пры дапамозе ўпаўнаважанага па перавыбарах — начальніка міліцыі тав. Возьнячука Ермачонак зноў застаўся ў сельсавеце. На працягу сваёй працы Ермачонак усе заможныя гаспадаркі фіктыўна падзяліў і перавёў у „бednякі". Шэраг родзічаў Ермачонкі: Сіняк Базыль, Беркіны, Ермачонкі, Арцём, Хвёдар і іншыя, карысталіся штогодна дзесяткамі га зямлі з лясного фонду Арэшкаўскага лясьніцтва і запасных зямельных фондаў. І гэтая зямля ў сельска-гаспадарчы падатак ня ўлічвалася.

Пры дапамозе старшыні сельсавету Ермачонка, яго родзічы Ермачонак Арцём і іншыя па хлусьлівых актах, нібы, за падохшых кароў, з Бярэзінскага страх-агенцтва атрымлівалі страх-узнагароды.

Прыватнік Клебанаў Янкель, які мае два заводы: смалагонны і маслабойны, вадзяны млын, эксплёатуе рабочых, мае шэсьць га сенажаці, лічыцца „земляробам-бедняком" пры разьмеркаваньні запаснага зямельнага фонду ў вёсцы Прудох у 1928 годзе быў надзелен як бядняк 3 га пахатнай зямлі. Дзеці Клебанава па дакумантах РВК, як „беднякі", працуюць у прамыслова-коопэратыўнай дрэваапрацоўчай арцелі ў горадзе Крэменчугу. Адзін з іх—Мордух вучыцца ў тэхнічным ВНУ у горадзе Ленінградзе і толькі летам 1929 году Клебанаў быў пазбаўлен выбарчых правоў.

Начальнік Бярэзінскай райміліцыі Возьнячук кіруючы перавыбарамі сельсавету ў 1928 годзе тым, хто спрабаваў выкрываць злачынствы старшыні сельсавету, пагражаў арыштам і за гэта быў арыштован бядняк Капустоў Ахрэм.



Справы Возьнячука

У 1928 годзе п'яны Ермачонак зьбіў комсамольца Сіняка і пры расьсьледваньні гэтых фактаў начальнік міліцыі справу замарынаваў.

Былым аб'ешчыкам Арэшкаўскага лясьніцтва Патоліціным пры дапамозе старшыні сельсавету Ермачонка зроблена шмат злачынстваў, Ермачонку дарэмна адпускаўся лес, зроблена шмат грашовых падлогаў.

Калі ў канцы мая 1929 году было заяўлена Бярэзінскаму райкому партыі, аб непарадках у Арэшкаўскім сельсавеце, дык сэкратар райкому тав. Бобікаў адказаў: што „Ермачонак ёсьць самы лепшы сельсавецкі працаўнік" (?!). Нарэшце Ермачонар зьбег і сьледчыя ворганы яго шукаюць.

У вёсцы Жарноўкі летам 1928 года згарэлі 21 гаспадарка, якія ў тым-жа годзе па пастанове Бярэзінскага РВК з лясьніцтва атрымалі без платы на будынкі лесу. Але былы валасны старшыня Тышкевіч, які зьяўляўся ўпоўнаважаным гэтай-жа вёскі пачаў зноў хадайнічаць, каб атрымаць лесу і дабіўся ад Берэзінскага РВК пастановы на атрыманьне лесу з Арэшкаўскага лясьніцтва ў другі раз. Калі лясьнічы Маров на гэта не згадзіўся, дык з боку РВК лясьнічаму была прыпісана валакіта і бюрократызм, справа нават знаходзілася ў нарсудзе. Урэшце ў сакавіку месяцы таго-ж году па пастанове РВК быў адпушчан у другі раз 21 гаспадарцы высокагатунковы экспортны лес. Гэты лес дужа тоўсты, для сялянскіх будынкаў ня-годны. І, па-колькі ў пагарэльцаў хаты ўжо былі пабудованы, па просьбе таго-ж самага былога валаснога старшыні Тышкевіча старшыня Бярэзінскага РВК тав. Хацкевіч пачаў хадайнічаць перад Мен Акр. Выканкомам, аб дачы дазволу гэтым грамадзянам на продаж лесу. Зараз калі Бярэзінскія чыноўнікі ўбачылі небясьпеку выкрыцьця ўсёй справы, дык накіравалі ў Лагойск да лясьнічага свайго дэлегата з просьбай, каб той ня выкрываў злачынцаў.

Мы лічым, што за ўсе гэтыя бясчынствы вінаватыя павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

КОЛІК.

АГЛЯД ГАЗЭТЫ „КОМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ“

1500 калгасьнікаў абгаварвалі даклад рэдакцыі

Другі тыдзень ідзе масавы агляд-абсьледваньне газэты „Камунар Магілеўшчыны“. У пяршыню, за ўвесь час існаваньня газэты, была склікана агульна-гарадзкая канфэрэнцыя чытачоў газэты, на якой прысутнічала звыш 200 чалавек. Канфэрэнцыя прайшла з пад'ёмам, актыўна, у спрэчках удзельнічала звыш 15 асоб.

У калгасы Клімавіцкага і Шклоўскага раёнаў, Магілеўскай акругі праведзены выезды прадстаўнікоў рэдакцыі газэты „Камунар Магілеўшчыны“ і комісіі сэктару друку АПАД ЦК КП(б) і АК КП(б)Б.

На шматлікіх сходах калгасьнікаў і партыйна-савецкага актыву гэтых раёнаў прысутнічала 1450 чалавек

У астатніх раёнах акругі даклады рэдакцыі абгаварваюцца на шырокіх сходах. Даклады рэдакцыі таксама абгавораны на найбольш буйных прадпрыёмствах Магілева.

Па ініцыятыве Прэзыдыуму Гарсавету даклад рэдакцыі будзе заслуханы на чарговым пленуме Гарадзкога Савету.

Пачынаньне рабочых гарбарні імя Лекарта, якія першымі стварылі брыгаду ўдарнікаў па распаўсюджаньню газэты, знайшло жвавы і шырокі водгук на астатніх прадпрыёмствах і ў калгасах. Першапачатковыя, прыблізныя вынікі гавораць аб павялічэньні за першыя два тыдні агляду колькасьці падпішчыкаў газэты на дзьве тысячы экзэмпляраў.

Адбылася ў Магілеве нарада актыву колгасаў, рэдкалегій насьценных газэт і селькораў, разам з працаўнікамі рэдакцыі і агітпропамі раённых камітэтаў партыі. Нарада, на якой выказалася ў спрэчках звыш 20 чалавек, вызначала шэраг практычных мерапрыемстваў на палепшаньню асьвятленьня ў газэце пытаньняў калгаснага руху.

У завочным мітынгу чытачоў, які праводзіцца на старонках газэты, выказалася 117 асоб і ўстаноў, сьпіс „праноўцаў“ яшчэ ня вычарпан і налічвае каля 40 чал.

Рэдакцыя газэты, разам з АКК, па ініцыятыве камісіі сэктару друку АПАД ЦК КП(б)Б і АК КП(б)Б, пры ўдзеле атраду „лёгкіх кавалерыстых“, правяла „тыдзень праверкі р сьсьледваньня допісаў, як надрукаваных у газэце, так і дасланых на расьсьледваньне“.

„Тыдзень праверкі“ выявіў некалькіх злосных дэлакопаў самакрытыкі, справа якіх будзе разгледжана на адчыненым паказальным пасяджэньні Бюро скаргаў РСІ.

Да недахопаў у правядзеньні агляду-абсьледваньня належыць аднесьці недастатковую і слабую „раскачку“ па масаваму абгаварэньню задач газэты у зьвязку з суцэльнай калектывізацыяй акругі, у тых раёнах, у якіх не адбыліся выезды прадстаўнікоў рэдакцыі, а таксама недастаткова энэргічнае ажыцьцяўленьне па асобных прадпрыемствах і ў асобных колгасах тых практычных мерапрыемстваў, якія прымаліся ў час абгаварэньня дэйнасьці рэдакцыі.

Нездавальняючым таксама трэба лічыць удзел рабкораў і рэдкалегій насьценных газэт гораду Магілеву, якія ў сваёй масе, за асобнымі выключэньнямі, недастаткова непасрэдна ўдзельнічаюць у правядзеньні агляду.

НОВЫ ФІЛЬМ „ВОЛАТ“

Белдзяржкіно выпушчэн новы кіно-фільм „Волат“. Фільм у асноўным адбівае барацьбу Савецкай Беларусі з нямецкімі і польскімі акупантамі і разгорнутую соцыялістычную будоўлю пасьля грамадзянскай вайны. Рэжысэр Корш.



На здымку: кадр з фільму „Волат“.

Няхай жыве японскі пралетарыят і яго правадыр компартыя

Голас протэсту менскай вытворчай чыгуначнай сямігодкі

Заслухаўшы інформацыю аб нячувана-зьверскай расправе, якую рыхтуе японскі імпэрыялізм над лепшымі прадстаўнікамі працоўных Японіі, мы вучні і настаўнікі менскай фабрычна-заводзкай сямігодкі протэстуем супроць гэтай ганебнейшай расправы імпэрыялістых над барацьбітамі за вызваленьне японскага пролетарыяту ад уціску капіталу.

У адказ на гэты ганебны ўчынак японскага імпэрыялізму мы ўсе вучні школы ўступаем у шэрагі МОПР'у.

Сярод вучняў правядзем збор сродкаў і інтэрнацыянальную грыўню.

Настаўніцтва праводзіць адлічэньне на карысьць політычных вязьняў паўпроцанту са сваёй месячнай пэнсіі.

Выклікаем усе іншыя чыгуначныя школы пасьледаваць нашаму прыкладу і выказаць свой голас протэсту супроць японскіх катаў.

Няхай жыве Японскі пролетарыят і яго правадыр Комуністычная Партыя.

Няхай жыве Комінтэрн—штаб сусьветнай рэволюцыі.

У ЦК УсеЛКСМ

МАСКВА, 6. — Сёньня выяжджаюць цэнтральныя брыгады ЦК УсеЛКСМ, Дзяржгандлю і Цэнтрасаюзу на організацыю ўсесаюзнага збору прадметаў другараднага экспорту. Брыгады па 3—6 чалавек едуць у Сібір, у краіну ЦЧВ, Урал, Ніжагародзкі край і інш.

МАСКВА. — ЦК УсеЛКСМ вырашыў склікаць у сярэдзіне лютага месяцу ў Маскве зьезд бытавых комун рабочай і сялянскай моладзі. ЦК УсеЛКСМ адначасова зьвярнуў увагу комсамолу ў вёсцы на неабходнасьць быць застрэльшчыкамі аграмаджаньня быту.

МАСКВА, 6. — Зачынілася першая Усесаюзная савгаская нарада комсамолу.

Піонэрская дэлэгацыя ў Азэрбайджан

З мэтай умацаваньня інтэрнацыянальнага выхаваньня піонэраў і школьнікаў, даючы адпор шэрагу шовіністычных выступленьняў, якія маюць месца ў школах, з мэтай наданьня справе інтэрнацыянальнага выхаваньня больш масавых жывых формаў бюро ЦК ЛКСМБ пастанавіла, **паслаць інтэрнацыянальную дэлегацыю піонэраў і школьнікаў БССР у ліку 15 чалавек у часе зімовых вакацый ў Азэрбайджанскую рэспубліку.**

Дэлегацыя выедзе 25-га студзеня і прабудзе ў Азэрбайджане 7 дзён.

Выбары дэлегатаў будуць праходзіць на агульна-гарадзкіх конфэрэнцыях піонэраў і школьнікаў. Дэлегаты якія паедуць, павязуць з сабою шэраг матар'ялу па рабоце піонэрскай організацыі БССР.

Ня ведаюць аб плянах ільнозагатовак

У Жытнавіцкім раёне вельмі слаба праходзяць загатоўкі ільну. Гэты раён у загатоўках ільну значна адстае ад другіх раёнаў Мазырскай акругі. Ня ўсе кіраўнікі раёну ўразумелі рашаючае значэньне гэтай кампаніі. Па пытаньню ільназагатовак ня былі праведзены сходы сялян.

Удзел комсамольскіх ячэяк і колектываў у загатоўчай кампаніі ільну-валакна быў і ёсьць надзвычайна слабы, бо райком ня даў дырэктыў па правядзеньню гэтай працы. Атрадам „Лёгкай Кавалерыі“ ня ўжыты захады да выкрыцьця злосных нядатчыкаў лішкаў ільнавалакна.

Майхтман.

„Чырвоная Зьмена“ дапамагла

У № 284 газэты „Чырвоная Зьмена“ зьмешчан допіс пад назвай „Галярэя пралаз“, у якім пісалася, што ў Рагачэўскім Пэдтэхнікуме вучыцца гандляр Еўзін, ЦКК РСІ паведамляе, што заметка пацьвердзілася і ЕЎЗІН З ТЭХНІКУМУ ВЫКЛЮЧАН.

***

На прысланы ў рэдакцыю „Чырвонай Зьмены“ допіс пад назвай „Кулакі пад аховаю сельсавету“, у якім пісалася, што ў вёсцы Мельякоўка, Студзенецкага сельсавату, Касьцюковіцкага раёну, Магілеўшчына, кулак Сапачоў Сяргей мае батракоў і не абкладзен у індывідуальным парадку. Касьцюковіцкі РВК паведамляе, што Сапачоў да абкладзен у індывідуальным парадку і справа перададзена на зацьверджаньне Акрфа.

***

У „Чырвоную Зьмену“ быў прысланы допіс пад назвай „Парадкі і справы“, у якім пісалася, што кіраўніцтва Аршанскага камбінату і бойні праводзіла на практыцы скрыўленьне клясавай лініі, дапускаліся на бойню рэлігійныя элемэнты, якія ніякага дачыненьня да коопэрацыйных дзяржаўных установ ня мелі. Аршанская РСІ паведамляе, што ФАКТЫ ПАЦЬВЕРДЗІЛІСЯ, згодна пастановы колегіі РСІ матар'ял перададзен у камісію па чыстцы савецкага апарату.

***

На прысланы ў рэдакцыю допіс пад назвай „Хто ў нас пралез у бедякі“, у якім пісалася, што ў члены Нова-Ельнянскага камітэту ўзаемадапамогі пралез былы жандар Маслакоў Раман, які карыстаецца дапамогай, Лагойскі РК КП(б)Б паведамляе, што былшаму старшыні КСУ Добравольскаму за гэта ў час чысткі партыі вынесена вымова, а Карабанку, які ў сучасны момант працуе ў КСУ—выключылі з КП(б)Б.

***

На зьмешчаную ў № 83 „Чырвонай Зьмены“ заметку пад назвай „Пане Ліўшыц“, Бабруйская акруговая РСІ паведамляе, што Ліўшыц па чыстцы савецкага апарату Асіповіцкага раёну — ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ.

***

У „Чырвоную Зьмену“ быў прысланы допіс аб тым, што ў Барысаўскім БПТ вучацца варожыя элемэнты: Лісоўскі і Конанава В. Наркамасьветы БССР паведамляе, што ПАМЯНЁНЫЯ АСОБЫ З ТЭХНІКУМУ ВЫКЛЮЧАНЫ.

Па тэлефону 12-19

На работу ў колгас

Комсамольская ячэйка рамонтных майстэрань насылае двух комсамольцаў на работу ў колгасы. Сакалоўскага арганізатара ўдарнай брыгады з 5-ці гадовым вытворчым стажам, і Мірановіча з 6-ці гадовым вытворчым стажам. Абодвы таварышы добраахвотна далі згоду на паездку ў колгасы.

М.

Трактар падшэфным

Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі і ўдарнай брыгады цэнтральнай базы гандлёва-будаўнічага трэсту праведзен збор сродкаў на пабудову трактару для падшэфнай вёскі Амяльянаўскага сельсавету Сьмілаўскага раёну. Першы дзень збору даў звыш 500 рублёў.

Некаторыя рабочыя будуць адпрацоўваць па два-тры дні, служачыя па 3-4 дні. Рабочыя базы выклікалі ўсіх рабочых і служачых усіх пабудоў гандлёва-будаўнічага трэсту пасьледаваць іх прыкладу.

Лео.

Саюзныя навіны

Дзіцячым брыгады ў раёны суцэльнай колектывізацыі

Сакратарыят Мен АК ЛКСМБ пастанавіў паслаць у час зімовых вакацый 30 дзіцячых брыгад (па 3 чалавека ў кожнай) у раёны суцэльнай колектывізацыі—Сьмілавіцкі і Копыльскі. Брыгады дапамогуць піонэрскім атрадам у рабоце па колектывізацыі, а таксама організуюць новыя піонэрскія атрады.

Масавая экскурсія на Украіну

Бюро ЦК ЛКСМБ пастанавіла лічыць неабходным правядзеньне масавай экскурсіі на Украіну рабочай і працоўнай моладзі.


Для падрыхтоўкі і правядзеньня экскурсіі вылучана організацыйная тройка у складзе т.т. Харытановіча, Харкова і Кагановай.

ШАШКІ № 3 6-І—29 г.

пад рэдакцыяй І. А. БЫЧКОЎСКАГА.

ЗАДАЧА № 3.

А. І. ШОШЫНА (пам. 1906 г.).
„Шах. Аб.“ за 1901 г.




Белыя: Да3, b5, c3, c5; пр. b4, c7, e1, h2.

Чорныя: пр. a5, g5, h6.

Белыя пачынаюць і зачыняюць дамку і простую чорных.

ЗАДАЧА № 4.

І. А. БЫЧКОЎСКАГА (Менск).
Памяці А. І. Шошына



Белыя: Да3, e4, d6; пр. f2, g1, g3, h4.

Чорныя: пр. g7, h8.

Белыя пачынаюць і зачыняюць 2 (дзьве) простых.

Прозьвішчы чытачоў, даслаўшых правільныя рашэньні, будуць надрукаваны.

У 1906 г. у пачатку студзеня, памёр адзін з лепшых аматараў і кампазытараў у шашачнай гульні А. І. Шошын.

Зьмяшчаем лепшую яго задачу і цікавую партыю.

Партыя № 2

Касяк

Гуляна ў Маскве ў 1893 г.

М. І. Кавалёў; А. І. Шошын.

1. g3-f4, f6-g5, 2. c3-b4, g7-f6; 3. b2-c3, f6-e5, 4. b4-a5, e5:g3, 5. h2:f4 h8-g7, 6. a1-b2? (Кепскі ход, які прайграе партыю. Трэба 6. c3-b4) e7-f6! 7. f2-g3 (Іншае хутчэй прайграе) g5-... 8. e3-d4, b4:f2, 9. g1:g3, d6-c5, 10 ... (Лепшага няма) c5-b4!! 11. a3:... h6:g5!, 12. f4:h6, f8-e7! 13. h6:d6, c7:... 14. a5:c7, b8:b4, 15. c3:a5, e5:a1 выйгрываюць Вельмі прыгожая партыя.

ХРОНІКА

1-ы малы шашачны чэмпіянат СС..., які адбыўся ў Маскве з 1-XII па 15-..., зачыніўся з вынікамі:

1-я група—Перэльман (Баку) + 15½ з 21, 2-я група—Тімноўскі (Маск... +15½ з 21; 3-я група—Нарскі (Масква) і Раманаў (Харкаў) па +15 з ...

Пабудуем трактар „Комсамолец БВА“

Бюро комсамольскай групы беларускага артылярыйскага палка на сваім пасяджэньні вынесла пастанову аб пабудове другога трактару „Комсамолец БЗА“.

У сувязі з разгортваньнем работы па вярбоўцы ў колгасы чырвонаармейцаў, належачых да дэмобілізацыі ў гэтым годзе і жадаючых організавацца ў колгас, комсамол ідзе насустрач і наладжвае добраахвотны збор сродкаў.

Збор сродкаў с род начальствуючага політычнага і чырвонаармейскага складу палка пачаўся.

КОМСАМОЛЬЦЫ АРТПАЛКА В... КЛІКАЮЦЬ ПАСЬЛЕДВАЦЬ ІХ ПРЫКЛАДУ ЎСЕ ВАЙСКОВЫЯ ЧАСЬЦІ БВА.

СЯРДЗЮКОЎ.

Паштовая скрынка

Чабарыку — „Прыклад без адказнасьці“, Комсамольцу — „Працаўнікі“, Чарэмхе — „Кулакі на адказнай працы настаўнікаў“, Горацішчанскай Лёгкай кавалерыі — „Аб чужаках у Маскве“, Шмелю „Чысьцілі ня чысьцілі“, Аўтару допіса — „Аб Комунары Магілёўшчыны“, Зьмітраку — „Чыстка прайшла і я застаўся“, Крупу Івану — „П'яніцы і лішэнцы комунары“. Горкаму — „Аб цеглянне“ і „школе“, Палыні — „Будучы настаўнік, былы бюрократ“, Другому воку — „А гэта не протэкцыянізм“, Рудману — „Аб чыстцы савапарату“, Біруле — „Заява“ — пералічаныя допісы накіраваны на расьсьледваньне і прыняцьця належных мер.

Т. В. — „Аб комсамолцы, якая ня прымае ўдзелу ў чыстцы“, Віначураву „Дапаможам зьнішчыць недахопы“, Комсамольцу — „Удзел комсамольцаў у чыстцы Любанскага апарату“, Пратэсене — „Вычысьцілі нягодных элемэнтаў з савецкіх установ“, Фрыдру Х. — „...ала ўвагі чыстцы“, Асфальду — „Аб слабай падрыхтоўцы брыгады „Л. К“ да чысткі“ — пералічаныя допісы ня пойдуць, слабыя, лепш карыстайце ў насьценгазэце.

Міхасю Махначу — „Соцыяльна чу...ды“, Кавалерыстаму — „Гнаць так юнкораў“, Комсамольцу — „Сэкратар дае прыклад“, А. Х. — „Гурток ... тыжнікаў“, Чачотцы — „Ле кля... васьць“. — Памянёныя допісы друкавацца ня будуць, так як да болшасьці асоб адзначаных у допісе меры прыняты, а рэшту допісаў ... жаце выкарыстаць у насьценгазэту.

Адказны рэдактар
А. Джэлю...

Менск, друкарня БДВ.
Галоўлітбел 599